Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

30 САКАВІКА 2012 г. ПЯТНІЦА № № 62 (27177) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



6 красавіка, 2

**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**31 КАНАЛ**

**Анонс лепшых фільмаў на кожны дзень.**



**Некалькі дзесяцігоддзяў таму ў вёсках пражывала 60-70% насельніцтва, а сёння — толькі 27%, і гэта не мяжа, бо ў эканамічна развітых краінах вясковае насельніцтва складае ўсяго 8-10%.**

СТАР. 6



**Нават любыя высокія тэхналогіі, найсучасная лекавая тэрапія і самыя эфектыўныя пілюлі акажуцца неэфектыўнымі, не дапамогуць гіпертоніку, які не змяніў уласны лад жыцця.**

СТАР. 8

## БАЗАВАЯ АРЭНДНАЯ ВЕЛІЧЫНЯ Ў БЕЛАРУСІ З 1 КРАСАВІКА СКЛАДЗЕ Br54 тыс.

**Адпаведны ўказ № 150 «Аб некаторых пытаннях арэнды і бязвыплатнага карыстання маёмасцю» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 29 сакавіка.**

Дакументам удасканальваецца парадак вызначэння памеру арэнднай платы па аб'ектах нерухомай маёмасці, якая будзе вызначацца з улікам базавай арэнднай велічыні.

У далейшым памер базавай арэнднай велічыні будзе штогод устанаўлівацца Саветам Міністраў з улікам гадавога ўзроўню інфляцыі (індэкса спажывецкіх цэн за мінулы год у адносінах да папярэдняга) і прымяняцца з 1 красавіка гэтага года. Такім чынам, ствараецца зразумелы і прадказальны механізм змянення арэнднай платы за здадзеную ў арэнду нерухомую маёмасць, растлумачылі ў прэс-службе.

Індэкс спажывецкіх цэн за 2011 год у параўнанні з 2010 годам склаў 153,2 працэнта. У сувязі з гэтым базавая арэндная велічыня разлічваецца як здабытак дзеючай у 2011 годзе базавай стаўкі і індэкса спажывецкіх цэн (35000 x 153,2 працэнта = 53620 (54 000).

Указам таксама адмяняецца дзяржаўнае рэгуляванне памеру арэнднай платы за гандлёвыя месцы на рынках і ў гандлёвых цэнтрах, якія знаходзяцца ў прыватнай уласнасці. Фарміраванне арэнднай платы за такія гандлёвыя месцы будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з нормамі Грамадзянскага кодэкса па пагадненні бакоў.

Дакументам вызначаецца, што ажыццяўленне арандатарам неаддзельных паляпшэнняў арандаванай нерухомай маёмасці не будзе з'яўляцца падставай для павелічэння памеру арэнднай платы. Гэта забяспечыць абарону арандатараў ад росту арэнднай платы ў сувязі з праведзенымі імі паляпшэннямі маёмасці.

З улікам практыкі прымянення ўказа ад 23 кастрычніка 2009 года № 518 «Аб некаторых пытаннях арэнды і бязвыплатнага карыстання маёмасцю» ўдакладняюцца арганізацыі, якія пералічваюць атрыманыя ад здачы ў арэнду сродкі ў рэспубліканскі бюджэт, а таксама памер такіх пералічэнняў.

Акрамя таго, ва ўказе прапісаны юрыдычныя асобы, якім маёмасць прадастаўлена ў бязвыплатнае карыстанне.

## ДАРОГУ! МУЗЫКІ ІДУЦЬ!



Як выдатны вясковы будаўнік, Уладзімір Корнеў рубіў аднавяскоўцам хаты ў «просты вугал», у «лапу», у «крук», рабіў «іспанскі замак». Яшчэ ён сам робіць сталярны рыштунак, якім лёгка і проста і бандарыць, і дзверы з вокнамі вырабляць. Але найбольшая ягоная «слабасць» — гармонікі. «Нямецкі строй», «рускі строй» — на любым строі сыграе так віртуозна і з такімі пачуццямі, што нават прафесіяналы здзіўляюцца.

— Я гарманіст-самавук, з дзяцінства цяга была іграць, але толькі ў 17 гадоў набыў свой першы гармонік, — кажа 73-гадовы жыхар вёскі Трасціно Хоцімскага раёна Уладзімір Захаравіч Корнеў. — Мяне хлебам не кармі, дай пайграць...

Некалькі гадоў таму ў сталічным універсітэце культуры і мастацтваў збіралі самых выдатных гарманістаў Беларусі. Корнеў быў прызнаны лепшым сярод іх. Але ўнікальнасць гэтага музыкі не толькі ў тэхніцы пераборaў на клавішах самага народнага інструмента, а ў тым, што ён з'яўляецца яшчэ і спецыялістам па рамонце гармонікаў. Сёння такіх майстроў у краіне — лічаныя адзінкі. Нават з суседняй Расіі вязуць да яго «лячыць» і саматробныя, і фабрычныя інструменты. Вось чаму можна без перабольшвання казаць, што ў гэтага чалавека не рукі, а сапраўдны цуд.

Уладзімір Захаравіч марыць, што ягоным рамяством зацікавяцца ўнукі і праўнукі (у яго іх ажно васямнаццаць). Але пакуль толькі адзін унук Максім *(на фотаздымку)* падзяляе дзедава захапленне і вучыцца іграць.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

*Хоцімскі раён.*

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый КАЛІНКОВІЧ, намеснік старшыні Вярхоўнага Суда Беларусі:**

***«Тыя нормы, якія перашкаджаюць развіццю нармальнай дзелавой ініцыятывы, вядома, трэба разглядаць з пункту гледжання карэкціроўкі. У той жа час нельга ператвараць гэты працэс ва ўсеагульную амністыю, калі шэраму прадпрымальніку было б працаваць больш камфортна, чым беламу».***

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.03.2012 г.**

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8070,00 | ▲ |
| Еўра | 10750,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 275,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1004,86 | ▲ |

**НАДВОР'Е СЁННЯ**

| | |
|---|---|
| Брэст | + 9° |
| Віцебск | + 5° |
| Гомель | + 6° |
| Гродна | + 8° |
| Магілёў | + 6° |
| Мінск | + 7° |

## НЕАБХОДНА ЎЖО Ў ГЭТЫМ ГОДЗЕ СТВАРЫЦЬ ТРЫВАЛУЮ АСНОВУ ДЛЯ ПАСКАРЭННЯ ЭКАНАМІЧНАГА РОСТУ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад кіраўніцтва Гродзенскай вобласці аператыўнага вырашэння існуючых у рэгіёне праблем. Адпаведную задачу кіраўнік дзяржавы паставіў 29 сакавіка, заслухоўваючы рабочы даклад губернатара Сямёна Шапіры аб сацыяльна-эканамічным развіцці Гродзеншчыны.**

Гэта мерапрыемства стала завяршальным у чарадзе аналагічных рабочых дакладаў кіраўнікоў рэгіёнаў Беларусі, якія адбыліся раней.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, губернатарскі стаж Сямёна Шапіры складае толькі 2 гады, але гэта ўжо дастатковы тэрмін, каб даваць ацэнкі вынікам праведзенай работы. «Пакуль сярод іншых рэгіёнаў краіны вобласць выглядае не так, як нам хацелася б. Па выніках мінулага года Гродзеншчына была ў ліку адстаючых як па колькасных, так і па якасных параметрах сацыяльна-эканамічнага развіцця», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы, у прыватнасці, звярнуў увагу на тое, што ў вобласці самы вялікі ўзровень запасаў гатовай прадукцыі на складах прамысловых прадпрыемстваў. «Да таго ж, як мне дакладвалі, некаторыя арганізацыі («Лідаграпраммаш» і іншыя) дазвалялі сабе пэўныя махінацыі са справаздачнасцю па запасах, утойваючы праблемы са збытам і пагаршаючы свой фінансавы стан», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, гэта прывяло да таго, што за мінулы год сумы чыстай страты, атрыманыя арганізацыямі вобласці, выраслі ў разы.

Акрамя таго, у Гродзенскай вобласці сярод астатніх рэгіёнаў самыя вялікія сумы пратэрмінаваных даўгоў перад банкамі, прычым асноўныя штрафнікі — гэта арганізацыі, якія падпарадкаваны непасрэдна мясцовай уладзе.

Рэгіён таксама знізіў пазіцыі па рэалізацыі жывёлы і птушкі на забой. «Але што яшчэ горш — усе мінулагоднія праблемы плаўна перацякаюць у гэты год. Вы зноў у ліку лідараў па запасах у прамысловасці, у ліку адстаючых па тэмпах сельгасвытворчасці і экспарту тавараў. Гэтыя праблемы трэба вырашаць, — запатрабаваў Прэзідэнт. — З такімі праблемамі ісці на парламенцкія выбары будзе вельмі складана».

«Нам жыццёва неабходна ўжо ў гэтым годзе стварыць трывалую аснову для паскарэння эканамічнага росту і рэалізацыі пяцігадовай праграмы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ЦЭНЫ НА САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ ДАСТУПНЫЯ ДЛЯ ЎСІХ

### СПЕЦЫЯЛІСТЫ МІНПРАЦЫ АДКАЗАЛІ НА ПЫТАННІ АБ ДЗЯРЖАЎНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАДТРЫМЦЫ

**29 сакавіка адбылася чарговая online-канферэнцыя сумеснага праекта Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі і БЕЛТА на тэму «Дзяржаўная сацыяльная падтрымка насельніцтва». На пытанні адказалі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна КАРАЛЁВА і спецыялісты міністэрства.**

ЗА ДОГЛЯД ДЗІЦЯЦІ-ІНВАЛІДА Ў ПЕРЫЯД ПРАХОДЖАННЯ ІМ МЕДЫЦЫНСКАЙ РЭАБІЛІТАЦЫІ БУДЗЕ ПРАДАСТАЎЛЯЦЦА БАЛЬНІЧНЫ ЛІСТ

**Сняжана ЖЫГУЛЁВА, Гродзенская вобласць:** *Ці рыхтуецца законапраект, які ўносіць змены ў закон «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» у частцы прадастаўлення права на дапамогу па часовай непрацаздольнасці асобе, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у перыяд праходжання ім курсу медыцынскай рэабілітацыі?*

**Начальнік аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Марына АРЦЁМЕНКА:** Зараз распрацоўваецца праект закона, які прадугледжвае выкладанне закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» у новай рэдакцыі. Законапраектам прадугледжваецца прадастаўленне дапамогі па часовай непрацаздольнасці асобе, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці-інваліда, у перыяд праходжання дзіцем-інвалідам курсу медыцынскай рэабілітацыі. Праект Закона будзе ўнесены на разгляд урада ў маі.

ЦЭНЫ НА САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ ДАСТУПНЫЯ ДЛЯ ЎСІХ

**Людміла, Мінск:** *Хто устанаўлівае цэны на сацыяльныя паслугі, якія аказваюцца тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва?*

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна КАРАЛЁВА:** Цэны (тарыфы — кошт норма-гадзіны) на сацыяльныя паслугі, якія аказваюцца дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання, зацвярджаюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

**ІВАНОВА А.І., Мінск:** *Якія зараз тарыфы на сацыяльныя паслугі і ці будуць яны расці? Чаму тарыфы адрозніваюцца ў залежнасці ад рэгіёна? Напрыклад, у Мінску пагадзінны догляд інваліда вельмі дарагі, далёка не ўсім па кішэні...*

**Валянціна КАРАЛЁВА:** Сацыяльныя паслугі прадастаўляюцца па агульнадаступных сацыяльна нізкіх цэнах. Так, цана норма-гадзіны на паслугі, якія ўваходзяць у пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг, складае ад 1 тыс. рублёў у Гродзенскай вобласці да 1550 рублёў у Віцебскай вобласці. Ва ўсіх абласцях, за выключэннем Гомельскай і Гродзенскай, кошт сацыяльных паслуг пераглядаўся ў мінулым годзе. У Гомельскай вобласці ён не змяняўся з 2010 года (1200 рублёў), у Гродзенскай — з 2009 года.

СТАР. 2

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**2 красавіка 2012 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца адкрыццё восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

### ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дзясятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю работу **2 красавіка 2012 года** ў **10 гадзін** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

**Рэгістрацыя** дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца **2 красавіка 2012 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.




**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Минского райпо (продавец)** проводит **повторный** открытый аукцион по продаже **здания магазина** (инв. № 600/С-104907), об. пл. **245 кв.м**, расположенного по адресу: **Минская область, Минский район, Папернянский с/с, д. Цнянка.**

**Начальная цена с НДС (снижена) – 1 016 400 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **0,0825 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина).

Объект обременен договорами аренды. Задаток **10%** от начальной цены перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **5 рабочих дней** после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение **30 (тридцати) банковских дней** со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 24.02.2012.

Аукцион состоится **11.04.2012 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.04.2012 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

**Вниманию акционеров открытого акционерного общества «Белагропромбанк»**

*Место нахождения общества: г. Минск, проспект Жукова, 3*

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что согласно решению годового Общего собрания акционеров, протокол от 23 марта 2012 года № 3, с 21 мая 2012 года будет осуществляться выплата дивидендов по итогам работы банка за 2011 год.

Размер дивидендов составляет:
- по привилегированным акциям – 300 руб. на 1 акцию;
- по простым (обыкновенным) акциям – 5,75 руб. на 1 акцию.

Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, формируется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 15 февраля 2012 года.

Выплата дивидендов акционерам ОАО «Белагропромбанк» осуществляется в Операционном управлении, филиалах (отделениях) банка:
- юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям в безналичном порядке путем зачисления на текущие (расчетные) счета;
- физическим лицам в безналичном порядке путем зачисления на счета для размещения вкладов (депозитов), карт-счета и иные в соответствии с законодательством либо в установленном порядке наличными денежными средствами.

**Дополнительная информация по телефонам: (8017) 229 64 54, 229 63 24.**

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ПОЛЬШЧЫ ГРУЗАВІК СУТЫКНУЎСЯ З ШАХЦЁРСКІМ АЎТОБУСАМ: ЗАГІНУЛІ ВОСЕМ ЧАЛАВЕК



На поўдні Польшчы ў буйной аўтамабільнай аварыі 8 чалавек загінулі і 10 атрымалі раненні. Пра гэта паведамляюць мясцовыя выратавальныя службы. Інцыдэнт адбыўся на трасе непадалёк ад мястэчка Жывец. «У выніку сутыкнення аўтобуса з прычэпам грузавіка сем чалавек загінулі на месцы, яшчэ адзін памёр у бальніцы», — паведамілі ратавальнікі. У аўтобусе знаходзіліся 16 шахцёраў, якія вярталіся з рабочай змены. Кіроўца грузавіка не пацярпеў. Прычыны аварыі высвятляюцца.

### САМІТ У БАГДАДЗЕ АДКРЫЎСЯ ТЭРАКТАМ

Моцны выбух адбыўся ў цэнтры Багдада 29 сакавіка — у дзень адкрыцця ў іракскай сталіцы саміту Лігі арабскіх дзяржаў. Бомба выбухнула ў раёне Сальхія непадалёк ад так званай «Зялёнай зоны», дзе размяшчаецца большасць дзяржаўных устаноў і замежных прадстаўніцтваў.

### ДЗЕВЯЦЬ ЧАЛАВЕК ПАРАНЕНЫ ПАДЧАС СТРАЙКУ Ў ІСПАНІІ

Дзевяць чалавек, з іх шэсць паліцэйскіх, паранены, яшчэ 58 пікетоўцаў затрыманы ў Іспаніі ў першыя гадзіны ўсеагульнай забастоўкі супраць прынятай новым урадам Марыяна Рахоя працоўнай рэформы, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на звесткі МУС краіны. Забастоўшчыкі арганізавалі пікеты і спрабавалі перашкодзіць руху аўтобусаў, а таксама блакавалі ўваход на аптовыя рынкі. Нарады паліцыі ўзялі пад кантроль усе важныя стратэгічныя аб'екты ў Мадрыдзе і іншых буйных гарадах. Усеагульная забастоўка праводзіцца па закліку вядучых прафсаюзаў Іспаніі супраць прынятай новым урадам працоўнай рэформы і скарачэння сацыяльных праграм. Чакаецца, што ў выніку забастоўкі будзе абцяжараны рух наземнага транспарту. Авіякампаніі Iberia, Air Nostrum і Vueling адмянілі 200 рэйсаў з іспанскіх аэрапортаў. Персанал бальніц таксама будзе выконваць толькі частку працы.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЕЎРАПЕЙЦЫ ШТОДНЯ ЎЖЫВАЮЦЬ У СЯРЭДНІМ ТРЫ СТАНДАРТНЫЯ ДОЗЫ АЛКАГОЛЮ

Дарослыя жыхары Еўропы штодня ўжываюць у сярэднім 3 стандартныя дозы алкаголю, гаворыцца ў новай справаздачы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя «Алкаголь у Еўрапейскім саюзе».

Сярэдні ўзровень спажывання алкаголю ў Еўропе эквівалентны 12,5 л чыстага этылавага спірту за год на душу насельніцтва сярод людзей, старэйшых за 15 гадоў. Гэта вышэй, чым у любой іншай частцы зямнога шара.

Еўропе належыць сумніўны гонар двухразовага перавышэння сярэднесусветнага ўзроўню спажывання алкаголю, што цягне за сабой несумнеўныя наступствы для здароўя саміх людзей, якія ўжываюць алкаголь, навакольных і для ўсяго грамадства.

Найвышэйшы ўзровень спажывання назіраецца ў Цэнтральна-Усходняй і Усходняй Еўропе — 14,5 л чыстага этылавага спірту на кожнага дарослага чалавека за год, 12, 4 л — у Цэнтральна-Заходняй і Заходняй Еўропе, 11,2 л — у Паўднёвай Еўропе і 10,4 л — у краінах Паўночнай Еўропы. Агульны ўзровень спажывання алкаголю ў Еўропе на працягу апошняга дзесяцігоддзя практычна не змяніўся.

НАДВОР'Е

### У нядзелю — сур'ёзныя халады

У апошнія дні сакавіка ў Беларусі чакаецца няўстойлівае надвор'е, калі Атлантычны цыклон прынясе да нас халодныя паветраныя масы з боку Нарвежскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

У суботу чарговы атлантычны цыклон пачне рухацца да нас з боку Балтыкі. Таму ўдзень месцамі мокры снег, уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 4 да плюс 3, удзень — 0—7 цяпла. Па-сур'ёзнаму пахаладае менавіта 1 красавіка. Часам будзе ісці снег, месцамі мяцеліца. На дарогах стане даволі слізка. У ноч на нядзелю чакаецца 0—7 марозу, удзень — ад мінус 3 да плюс 4 градусаў. Самай халоднай прагназуецца ноч на панядзелак. Тады бліжэй да раніцы тэмпература паветра знізіцца да 3—10 марозу, а ўдзень будзе толькі ад мінус 1 па поўначы да плюс 6 градусаў на поўдні краіны. Амаль паўсюдна будзе ісці кароткачасовы снег. Сіноптыкі прагназуюць, што халоднае надвор'е пратрымаецца ў нашай краіне мінімум да сярэдзіны наступнага тыдня.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЦІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ДЛЯ ВАС ГАРАДСКАЯ КВАТЭРА САМЫМ УТУЛЬНЫМ ЖЫЛЛЁМ?



**Андрэй Гаеў, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі, г. Мінск:**

— Сёння маё самае ўтульнае жыллё там, дзе я жыву, — гэта менавіта кватэра ў сталіцы. Параўноўваць яе з нейкімі шыкоўнымі катэджамі мне пакуль вельмі складана. Магчыма, з цягам часу ўзнікне жаданне мець нейкае жыллё далей ад шумнага горада і бліжэй да прыроды — напрыклад, побач з прыгожай ракой. Аднак, на мой погляд, не самае важнае, дзе гэты дом ці кватэра знаходзяцца, а тое, як ты сам асабіста там жывеш: як ты ладзіш з суседзямі і ўвогуле як ставішся да навакольнага асяроддзя.



**Вольга Фядотава, спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды:**

— Кватэра з усімі выгодамі ў горадзе мяне цалкам задавальняе. Так, яна не вельмі вялікая, але мне вялікая плошча жылля шчасця не прыбавіць... Галоўнае, каб у гэтым доме атмасфера была цёплай, каб там заўсёды гаспадарылі каханне і гармонія. Надвор'е ў доме — вось што галоўнае.



**Мікалай Прасталупаў, старшыня Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», г. Мінск:**

— Безумоўна тое, што мая кватэра — лепшая ў свеце. Менавіта для мяне. Зіма ў Беларусі доўжыцца амаль 8 месяцаў, таму жыць у халодны сезон трэба ў цёплай, добра абсталяванай кватэры. І не абавязкова, каб гэта жыллё было ў цэнтры горада, дзе даволі шумна. А вось летам трэба (пажадана) жыць побач з прыродай за горадам. Гэта можа быць дача, загарадны дом, катэдж ці нешта іншае, аднак... Нават там павінны быць усе цывілізаваныя выгоды і абавязкова з гарачай вадой, бытавой тэхнікай і інтэрнэтам. Добра, калі хапае фінансаў, каб усё гэта пабудаваць і купіць.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

■ Актуальна

# Пераход на чатырохгадовы тэрмін навучання не закране абітурыентаў 2012 года

**«Скарачэнне тэрмінаў навучання да чатырох гадоў на шэрагу спецыяльнасцяў ВНУ адбудзецца толькі з 1 верасня 2013 года», — пра гэта журналісту «Звязды» аўтарытэтна заявіў міністр адукацыі нашай краіны Сяргей МАСКЕВІЧ.**

Кіраўнік галоўнага адукацыйнага ведамства патлумачыў, што да канца бягучага каляндарнага года плануецца распрацаваць новыя адукацыйныя стандарты вышэйшай адукацыі, у якіх, пераважна, будзе рэалізавана схема 4 + 2: гэта значыць, чатыры гады навучання на першай ступені вышэйшай школы плюс два гады навучання ў магістратуры. «Тыя ж студэнты, якія ўжо навучаюцца ў ВНУ, і маладыя людзі, якія стануць студэнтамі ў 2012 годзе, будуць навучацца па дзеючых сёння адукацыйных стандартах, — удакладніў міністр. — Разам з тым, з 1 верасня 2012 года, паэтапна, пачынаючы са студэнтаў першага курса, пачне ўкараняцца новая канцэпцыя выкладання ў ВНУ сацыяльна-гуманітарных дысцыплін».

Прапанаваная ў канцэпцыі кампаноўка цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін складаецца з чатырох інтэграваных модуляў: філасофіі, эканомікі, паліталогіі і гісторыі. У кожным інтэграваным модулі вылучаюцца як абавязковыя для вывучэння дысцыпліны, так і спецыялізаваныя модулі, з якіх студэнты самі змогуць выбіраць дысцыпліны для вывучэння.

Канцэпцыя прадугледжвае змяншэнне колькасці аўдыторных гадзін і павелічэнне аб'ёму самастойнай работы студэнтаў. Мяркуецца даць кожнай ВНУ права самастойна кампанаваць інтэграваныя модулі з улікам профілю адукацыі і патрабаванняў абавязковага стандарту да кампетэнцый спецыяліста.

Вывучэнне дысцыпліны «Замежная мова» кіраўнікам ВНУ прапануецца арганізаваць у рамках цыкла агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін. У рамках цыкла агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін прапануецца таксама арганізаваць і вывучэнне курса «Беларуская мова. Прафесійная лексіка». А вось дысцыпліну «Фізічная культура» плануецца аднесці да цыкла «Дадатковыя віды навучання».

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Працяг тэмы

# Ратаваць ці руйнаваць?

**Грамадскія актывісты просяць Міністэрства культуры надаць дому ў Горках, дзе жыў пісьменнік Максім Гарэцкі, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. З такой прапановай звярнулася Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.**

Пра дыскусію, якая разгарнулася вакол дома № 3 на вуліцы Агранамічнай, што ў Горках, «Звязда» пісала яшчэ ў студзені (18.01.2012).

Нагадаем, што дом, пра які ідзе размова, быў пабудаваны ў 1925 годзе. З 1926 па 1928 год тут жыў Максім Гарэцкі, які ў той час загадваў кафедрай беларускай мовы ў сельскагаспадарчай акадэміі. Пра гэта сведчыць і мемарыяльная дошка на доме.

Цяпер будынак афіцыйна прызнаны аварыйным, жыхароў збіраюцца адсяліць у новыя кватэры. Раённыя ўлады меркавалі ў межах добраўпарадкавання да «Дажынак-2012» знесці стары дом, а памяць беларускага класіка ўвекавечыць іншым шляхам — напрыклад, паставіць помнік, які можа стаць сумесным праектам з горацкай грамадскасцю.

Аднак у Горацкі райвыканкам звярнуліся 56 чалавек з просьбай знайсці магчымасць усё ж захаваць дом. Актывісты лічаць, што гэта тыповы ўзор драўляных будынкаў пачатку XX стагоддзя, і ў ім можна размясціць дом-музей Максіма Гарэцкага.

Цяпер Міністэрства культуры будзе вырашаць, ці варты дом Гарэцкага (як яго тут называюць) статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Пра вынік разгляду мы даведаемся праз месяц.

Між тым, афіцыйны сайт Магілёўскага аблвыканкама паведаміў аб стварэнні ў Горках раённай грамадскай рады па захаванні і прымнажэнні гісторыка-культурных каштоўнасцяў, добраўпарадкаванні і сацыяльным развіцці горада і Горацкага раёна. Адбыўся ўстаноўчы сход, дзе вызначана галоўная задача рады — вывучэнне і фарміраванне грамадскай думкі па асабліва значных для жыхароў горада і раёна пытаннях, звязаных з захаваннем гістарычнай і культурнай спадчыны. Узначаліў раду рэктар Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Аляксандр Курдзека.

Ужо на ўстаноўчым сходзе рады абмяркоўвалі лёс старых дамоў, што на вуліцах Ціміразева і Мічурына ў Горках. Захоўваць іх ці знішчаць, ратаваць ці руйнаваць? Дыскусія працягваецца.

**Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ГУЧНЫЯ ДЭКЛАРАЦЫІ НЕ МОГУЦЬ ЗАМЯНІЦЬ РАЗВАЖЛІВАСЦЬ

Гучныя дэкларацыі не могуць замяніць разумны сэнс. Гэта адзначыў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі Андрэй Савіных, каментуючы БЕЛТА прынятыя Еўрапарламентам рашэнні па Беларусі. «На жаль, мы бачым стэрэатыпныя паводзіны, далёкія ад рэальнасці. Хацелася б нагадаць еўрапейскім парламентарыям, што гучныя дэкларацыі не могуць замяніць разважлівасць, а аднабаковае ўспрыманне рэальнасці можа толькі адтэрмінаваць, але не адмяняе неабходнасць пошуку алгарытму канструктыўнага ўзаемадзеяння», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства.

## СКЛЕРОЗ... З РАДАСЦІ

Без аўто і без грошай застаўся гамяльчанін, які прадаў расіянам свой «Опель-Зафіра» на аўтарынку «Асаўцы» ў Гомелі. Мужчына атрымаў 8600$ і па ўсіх правілах, праз натарыяльную кантору аформіў генеральную даверанасць на расійскага пакупніка.

Падчас продажу прысутнічаў яго сябар. Пералічыўшы грошы, гамяльчане папрасілі новых гаспадароў аўто падкінуць іх да месца жыхарства сябра. Развітаўшыся, зайшлі ў краму, каб затаварыцца і адзначыць паспяховы продаж. І толькі пасля «абмывання», у аўтобусе па дарозе дадому мужчына адкрыў барсетку і самлеў: «зялёных» няма. Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, міліцыянеры адпрацавалі некалькі версій. Грошы маглі выкрасці кішэнныя зладзеі ў краме або ў аўтобусе. Праверылі і сябра — на паліграфе. Не выключалі і самае банальнае: мужчына «пад градусам» проста згубіў скрутак з грашыма... Вырашылі праверыць і расійскага пакупніка. Праз натарыяльную кантору ўстанавілі яго асобу, звязаліся з калегамі з Бранскай вобласці. Праз некалькі гадзін высветлілася: у эйфарыі прадавец пакінуў пакет з грашыма ў аўтамабілі, які яшчэ зусім нядаўна быў яго маёмасцю. Пакупнікі самі прывезлі ўсю суму і перадалі гамяльчаніну.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## АЎТО ЎПАЛА З МОСТА Ў РАКУ



Удзень на мосце праз раку Жадунька ў вёсцы Узлогі Хоцімскага раёна кіроўца легкавога аўтамабіля «Шкода-Актавія» не справіўся з кіраваннем, прабіў агароджу і ўпаў з вышыні чатырох метраў.

— Шырыня ракі ў гэтым месцы 4 метры, глыбіня — 1,5-2 метры. Пасля падзення аўтамабіль перакуліўся. Унутры салона аказаўся заблакіраваны кіроўца, мужчына 1984 года нараджэння, жыхар Хоцімска, — паведаміў рэдакцыі старшы інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці МНС Алег Малевіч. — Выратавальнікі пры дапамозе троса падцягнулі легкавік, які атрымаў значныя механічныя пашкоджанні, да берага. Кіроўцу перадалі работнікам хуткай медыцынскай дапамогі, аднак тыя пасля правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў былі вымушаны канстатаваць смерць мужчыны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЦЭНЫ НА САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг зацверджаны пастановай Саўміна Рэспублікі Беларусь ад 8 чэрвеня 2001 г. № 858. Што тычыцца паслугі сядзелкі, то яна ў пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг не ўключана і прадастаўляецца цэнтрамі на пазабюджэтнай аснове. У кошце гэтай паслугі адлюстроўваюцца ўсе выдаткі, звязаныя з яе прадастаўленнем. У адпаведнасці з заканадаўствам цэны на паслугі сядзелкі таксама зацвярджаюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

Праграмай развіцця сацыяльнага абслугоўвання ў Мінску на 2011—2015 гг. прадугледжана пакрыццё выдаткаў у памеры да БПМ у сярэднім на душу насельніцтва (які дзейнічае на дату падачы заявы) непрацаздольным грамадзянам, што цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння, на аплату паслуг сядзелкі цэнтра.

**Пятрова У.І., Мінск:** *Чаму так павольна развіваецца інстытут сацыяльных сядзелак у нашай краіне? І гэта пры тым, што патрэба ў гэтых паслугах вельмі вялікая... Можа, справа ў высокіх тарыфах на сацыяльнае абслугоўванне?*

**Валянціна КАРАЛЁВА:** У тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва функцыянуюць аддзяленні тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання, якія прадастаўляюць непрацаздольным грамадзянам розныя сацыяльныя паслугі на даму: разавыя платныя сацыяльна-бытавыя паслугі; разавыя або часовыя паслугі пагадзіннага дзённага догляду грамадзян, што страцілі здольнасць да самаабслугоўвання; пастаянныя паслугі сядзелкі непрацаздольным грамадзянам, што цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння. Штатная колькасць названых аддзяленняў у сярэднім па рэспубліцы складае 5 штатных адзінак, і стварэнне ў іх службаў сядзелак заканадаўствам не прадугледжана.

Пры гэтым паслугі сядзелкі павінны прадастаўляцца грамадзянам за кошт пазабюджэтных сродкаў, за выключэннем адзінокіх непрацаздольных грамадзян, што цалкам страцілі здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння, якім такія паслугі могуць прадастаўляцца па агульнадаступных цэнах (за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў).

Цэны на ўсе сацыяльныя паслугі вызначаюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. На 01.01.2012 кошт паслуг сядзелкі ў г. Брэсце складаў 4240 руб. за гадзіну, а ў г. Мінску — 5240 руб. за гадзіну пры аказанні паслуг у дзённы час і 6080 руб. за гадзіну ў начны час. Для параўнання: кошт паслуг сядзелкі, якая працуе ў прыватным прадпрыемстве, складае не менш за 5 долараў ЗША за гадзіну.

Па выніках мінулага года колькасць сядзелак у цэнтрах складала 102 чалавекі. Іх паслугамі скарысталіся 212 грамадзян.

САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА МОЖА НАКІРОЎВАЦЦА НА ПАГАШЭННЕ ЗАПАЗЫЧАНАСЦІ ПА АПЛАЦЕ ПАСЛУГ ЖКГ

**Зоя ЦІХІШЫНА, Слуцк:** *Колькі чалавек атрымалі летась дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу ў безнаяўнай форме на аплату жыллёва-камунальных паслуг? І якія лічбы прагназуюцца на гэты год? Ці праўда, што сярод даўжнікоў ЖКГ малазабяспечаных людзей мала?*

**Начальнік аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання Таццяна ФЁДАРАВА:** Доля сродкаў штомесячнай і аднаразовай сацыяльных дапамог, прызначаных у 2011 годзе, якія былі накіраваны на аплату жыллёва-камунальных паслуг, складае 1,3% (1,1 млн рублёў). Чакаецца, што сёлета сума такіх сродкаў узрасце, паколькі Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 студзеня 2012 г. № 41 «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе» прадугледжана накіраванне сум штомесячнай і аднаразовай сацыяльных дапамог пры наяўнасці запазычанасці па аплаце жыллёва-камунальных паслуг не толькі на іх аплату, але і на пагашэнне запазычанасці па іх аплаце.

АДКРЫЦЦЁ БЭБІ-БОКСАЎ ДЛЯ ПАДКІДЫШАЎ МОЖА ПАВЯЛІЧЫЦЬ КОЛЬКАСЦЬ КІНУТЫХ ДЗЯЦЕЙ

**Варвара ЖЫЛУНОВІЧ,** *Гродзенская вобласць: Як вы ставіцеся да адкрыцця бэбі-боксаў у Беларусі? Мне здаецца, што гэты еўрапейскі вопыт было б мэтазгодна перанесці на нашу глебу.*

**Марына АРЦЁМЕНКА:** На мой погляд, важным з'яўляецца, каб нараджэнне кожнага дзіцяці было жаданым. Менавіта на гэта накіравана Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі. Сёння мы назіраем устойлівую тэндэнцыю зніжэння адмовы ад нованароджаных дзяцей, і яе важна захаваць. Адкрыццё бэбі-боксаў для падкідышаў можа прывесці да павелічэння колькасці кінутых дзяцей, паколькі бацькі не будуць несці ні маральнай, ні матэрыяльнай адказнасці.

РАШЭННЕ АБ ПРЫЁМНЫХ СЕМ'ЯХ ДЛЯ СТАРЫХ БУДЗЕ ПРЫНЯТА ПА ВЫНІКАХ ЭКСПЕРЫМЕНТУ

**Аксана ШЧУРКО, Полацк:** *Ці будзе развівацца ў Беларусі інстытут прыёмных сем'яў для старых? Дзе ў рэспубліцы гэтыя праграмы ўжо прыжыліся? Можа, ёсць сэнс даплачваць такім прыёмным сем'ям?*

**Таццяна ФЁДАРАВА:** Спецыялістамі Мінпрацы і сацабароны вывучаўся вопыт Расіі па функцыянаванні прыёмных сем'яў для грамадзян пажылога ўзросту. Такая форма жыццеўладкавання пажылых людзей актуальная і заслугоўвае ўвагі. У цяперашні час у некаторых раёнах Мінскай і Гродзенскай абласцей па рашэннях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў праводзяцца эксперыменты па пражыванні пажылых людзей у прыёмных сем'ях. Прапановы аб парадку і ўмовах прадастаўлення такой паслугі будуць падрыхтаваны па выніках правядзення названых эксперыментаў.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

# СУДАК — ПАД ЗАБАРОНАЙ

**З 1 красавіка па 30 мая пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ўстанаўліваецца забарона на лоўлю судака і забараняецца аматарскае рыбалоўства з выкарыстаннем спінінга.**

З мэтай стварэння спрыяльных умоў для аднаўлення звычайнага судака здабываць яго ў вышэйназваны тэрмін будзе нельга ў некаторых рыбалоўных угоддзях. У Лунінецкім раёне гэта канал «Мікашэвіцкі» — на працягу 2,5 кіламетра ўверх па канале ад месца ўпадзення яго ў раку Прыпяць, рака Прыпяць — на адлегласці 500 метраў уверх і ўніз па цячэнні ракі ад месца ўпадзення ў яе канала «Мікашэвіцкі». У Гродзенскім раёне да такіх рыбалоўных угоддзяў адносяцца: канал «Аўгустоўскі» — ад шлюза каля вёскі Немнава да месца ўпадзення канала ў Нёман, пойменныя вадаёмы Нёмана, «Келбаская затока» каля вёскі Келбаскі, «Беражанская затока» каля вёскі Бераждны. У Мастоўскім раёне «паляваць» на судака будзе забаронена ў пойменных вадаёмах Нёмана, на возеры «Стары Нёман-1» каля вёскі Харціца, на возеры «Вінабойскае» і возеры «Новае» каля вёскі Новінка, на затоне без назвы каля вёскі Дубна. У Магілёве і Магілёўскім раёне лавіць судака нельга будзе на ўчастку Дняпра і прылеглых пойменных вадаёмах у межах ад водазабору ААТ «Магілёўскі аўтамабільны завод імя С.М. Кірава» да вусця ракі Дзебра.

Ва ўказаных рыбалоўных угоддзях у перыяд з 1 красавіка па 30 мая забараняецца аматарскае рыбалоўства з выкарыстаннем спінінга. Дарэчы, гэтыя вадаёмы Брэсцкай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей з'яўляюцца месцамі найбольш масавага нерасту судака.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АБЗАЦ

◢ **Паміж грамадзянамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі летась зарэгістравана больш як 2,5 тыс. шлюбаў, што склала 3% ад усіх зарэгістраваных шлюбаў у нашай краіне. Колькасць шлюбаў па расійскім грамадзянстве жаніха склала 1325, а па расійскім грамадзянстве нявесты — 1215.**

◢ За апошнюю дэкаду сакавіка ў Брэсцкай вобласці зарэгістравана 7 выпадкаў звяртання да медыцынскіх работнікаў у сувязі з укусамі кляшчоў. Сярод пацярпелых — 5 дзяцей, у т.л. 6-месячнае дзіця. 3 кляшчы з 7 аказаліся заражанымі ўзбуджальнікамі хваробы Лайма.

◢ **Датацыя з бюджэту Мінска на пуцёўку ў загарадны лагер для дзяцей работнікаў бюджэтных арганізацый складзе сёлета да Br405 тыс. Згодна з ацэнкамі спецыялістаў, сярэдні разліковы кошт пуцёўкі ў загарадны лагер з кругласутачным знаходжаннем складзе Br1,6 млн.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ



◢ Шчаня рэкордна маленькага памеру з'явілася на свет у амерыканскім штаце Каліфорнія. Пры нараджэнні помесь таксы, якую назвалі Беёнсэ ў гонар папулярнай поп-зоркі , важыла ўсяго 28 грамаў і змяшчалася ў чайную лыжку. Малюпасенькі сабачка нарадзіўся апошнім з памёту пяці шчанюкоў, і ў яго не білася сэрца, аднак ветэрынарам удалося выратаваць жывёлку. Зараз двухтыднёвае шчаня змяшчаецца на айфоне або крэдытнай картцы і важыць усяго 124 грамы. На думку экспертаў, Беёнсэ можа паставіць новы сусветны рэкорд самага маленькага сабачкі на планеце.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## За кошт прадпрыемства

**Факты незаконнага выкарыстання службовай асобай Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода сваіх паўнамоцтваў выяўлены Мазырскім міжраённым Камітэтам дзяржаўнага кантролю.**

Так, са студзеня 2009 года па жнівень 2011-га на тэрыторыі ўласнага домаўладання кіраўніка прадпрыемства яго падначаленыя праводзілі рамонтна-будаўнічыя работы. Пры гэтым аплата іх працы, як і дастаўка да месца, ажыццяўляліся за кошт сродкаў прадпрыемства. У выніку заводу прычынена шкода ў суме 31 млн рублёў. Падчас праверкі гэтая сума ў поўным аб'ёме вернута кіраўніком у касу прадпрыемства. У дачыненні да гэтага грамадзяніна Мазырскім раённым аддзелам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь заведзена крымінальная справа.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Бутлегер нашага стагоддзя

**У Магілёве супрацоўнікі фінансавай міліцыі затрымалі 49-гадовага мужчыну, які спрабаваў гандляваць спіртнымі напоямі вядомых марак. Размова ідзе пра цэлую партыю нелегальных дарагіх алкагольных вырабаў: віскі, тэкілы, каньяку замежнай вытворчасці ў колькасці 57 літраў на суму 25 мільёнаў рублёў.**

Мужчыну затрымалі каля жылога дома на вуліцы Крупскай абласнога цэнтра, і пры сабе ў яго было 12 бутэлек віскі на суму 7 мільёнаў рублёў. Пры аглядзе яго кватэры знойдзена яшчэ 45 літровых бутэлек віскі і каньякоў, а таксама каталогі алкагольных вырабаў, якія прапаноўваліся да рэалізацыі. Алкаголь не быў маркіраваны акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь.



— Ёсць падставы меркаваць, што гэта не першы факт незарэгістраванай прадпрымальніцкай дзейнасці правапарушальніка, — паведаміў начальнік арганізацыйна-інспектарскага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай па вобласці Аляксандр Шаройкін. Магіляўчаніну пагражае штраф ад 30 да 50 базавых велічынь.

**Ілона ІВАНОВА.**

# ВЕЦЕР ПАЗРЫВАЎ ДАХІ

**На тэрыторыі Пухавіцкага раёна парывы моцнага ветру дасягалі 24 метраў за секунду.**

Былі пашкоджаны дахі некалькіх сельскагаспадарчых будынкаў. Шыфер пазрывала з малочнатаварных фермаў у вёсках Станіслававa і Навасёлкі. У вёсцы Дрычын вецер пашкодзіў дах навеса для сельскагаспадарчай тэхнікі, у пасёлку гарадскога тыпу Рудзенск — склада мінеральных угнаенняў. Удзень моцны вецер сарваў 100 лістоў шыферу на малочнатаварнай ферме ў вёсцы Ананчыцы Салігорскага раёна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



**Годовой отчет эмитента ценных бумаг**

**Полное наименование:** открытое акционерное общество **«Барановичский комбинат хлебопродуктов»**

**Адрес:** 225406, г. Барановичи, ул. 50 лет БССР, 21. Тел./факс 42 33 97

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2012 года** *млн. руб.*

| Наименование показателя | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **Актив** | | | |
**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Мая жонка мяне прываражыла».**
**9.40** Асяроддзе пражывання. «Таблеткі» ад усіх хвароб».
**10.40** «Смак».
**11.20** «Разумніцы і разумнікі».
**12.05 Маст. фільм «Выйшаў вожык з туману...».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Адваротны адлік».
**16.55** «Асцярожна, Нагіеў!».
**17.55** «Адзін супраць усіх».
**18.40** «Акадэмія талентаў». Фінал.
**21.05** «Што? Дзе? Калі?» Фінал.
**22.20 Закрыты паказ. Маст. фільм «Жыла-была адна баба».**

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.15** Звон.
**7.45** Мір вашаму дому.
**7.55** Скарбніца Гомельшчыны.
**8.20 Меладрама «Самерсбі».**
**10.25** Пра мастацтва.
**10.50, 21.05** Тэлебарометр.
**10.55** Школа рамонту.
**12.00** Пад грыфам «Вядомыя».
**12.35, 23.40** Шоу «Інтуіцыя».
**13.40** Наперад у мінулае.
**14.15** Беларуская кухня.
**14.50** Сакрэт фірмы.
**15.20** Дак. цыкл «Вышэйшая мера...».
**16.05 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры».**

## СТБ

**7.00** «Далёкія сваякі».
**7.10** «Анфас».
**7.25 Серыял «Салдаты-13».**
**9.00, 23.35** Тэніс. Кубак Дэвіса. Беларусь — Боснія і Герцагавіна. Дзённік.
**9.10** «Я — падарожнік».
**9.35** «Чыстая праца».
**10.25** «Мінск і мінчане».
**11.00 Маст. фільм «Рукі прэч ад Місісіпі».**
**12.50** «Прыгоды дылетанта».
**13.20 Маст. фільм «Не хадзіце, дзеўкі, замуж».**
**14.40** «Ваенная тайна».
**16.00** «Жанчыны XX стагоддзя».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40 Маст. фільм «Прадаецца дача».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Зроблена ў Амерыцы».**
**22.20** «Зорны рынг». Льяна Ібіс супраць групы «Лермонт».
**23.45 Маст. фільм «Кароль камедыі».**

## МІР

**5.00, 3.40** Дак. фільм «Гісторыя ВІА».
**6.00** «Даведнік».
**6.30 Маст. фільм «Грузінская хроніка XIX стагоддзя».**
**7.55** М/с «Прыгоды Мумі Троля».
**8.15** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**8.30** «Прыгоды Компаса і Будзільніка».
**8.45** «Эксперыментатары».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**9.40** «На шашлыкі. Рэнат Ібрагімаў».
**10.10** «Тайны манежа».
**10.40 Серыял «Справа была ў Гаўрылаўцы».**
**13.30** Дак. фільм «Доказы віны».
**14.00, 2.45** «Правілы жыцця».
**15.10 Маст. фільм «Закаханы».**
**16.50 Маст. фільм «Мэта жыцця».**
**20.10** «Навіны Садружнасці (бягучы радок). Культура».
**21.00 Маст. фільм «Дзяўчына з жамчужнай завушніцай».**
**22.45 Маст. фільм «Доўгае развітанне».**
**0.50** «Добрыя жарты».

## 8 КАНАЛ

**9.00, 11.25, 18.35, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**9.05, 16.35** «Мультпарад».
**9.15, 15.40** «Кінаблакнот».
**9.35** «На рыбалку».
**9.50 Серыял «24 гадзіны».**
**11.30 Драма «Шостае пачуццё».**
**13.30 Трылер «Выкуп».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**17.45 Серыял «Думаць як злачынец».**
**18.40 Меладрама «Дарога змен».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Каханне і магія».**
**22.55 Серыял «Уцёкі».**
**23.45** «Інэт».

## ВТБ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 20.00, 22.00, 23.00, 0.00, 0.30** Прагноз надвор'я.
**6.00, 0.30** «PLAY».
**8.30** «Гарадское падарожжа».
**9.00** «Дэкаратыўныя страсці».
**10.00** «Гэта маё дзіця».
**11.00** «Тэрыторыя іміджу».
**11.30** «Нязоркавае дзяцінства».
**12.00, 23.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**12.30, 23.30** Скетч-шоу «Масгарсмех».
**13.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**15.00 Серыял «Будбацька».**
**17.00** «Добрыя жарты».
**19.00, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**20.00 Серыял «Амазонкі».**
**22.00** «Нерэальная гісторыя».
**22.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Меладрама «Гувернантка».**
**8.40 Меладрама «Дзевяць прыкмет здрады».**
**10.25** «Ранішняя@пошта».
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.15** «Суботнік».
**11.55** «Відавочнае—неверагоднае».
**12.25 Дэтэктыў «Знайсці і абясшкодзіць».**
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** «Мацней за смерць. Малітва».
**15.45 Дэтэктыў «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку».**
**17.30** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.40 Серыял «Сваты- 5».**
**0.20** «Дзяўчаты».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.30 Серыял «МУР ёсць МУР».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Акадэмія прыгажосці».
**8.50** «Жывуць жа людзі!».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** Галоўная дарога.
**10.55** Кулінарны паядынак.
**11.55** Кватэрнае пытанне.
**13.20** «Жывыя легенды. Эдуард Успенскі».
**14.15 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**16.20** Следства вялі...
**17.10** Вочная стаўка.
**18.05** Выратавальнікі.
**18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.25** Прафесія — рэпарцёр.
**20.00** «Праграма максімум».
**21.00** «Рускія сенсацыі».
**22.00** Ты не паверыш!
**22.55 Серыял «Агент асаблівага прызначэння-2».**
**0.35 Маст. фільм «Братва па-французску».**

## ІНТЭР+

**7.00** Вялікая палітыка.
**9.40** Феерыя падарожжаў.
**10.00** Украіна, уставай!
**10.35** Не можа быць.
**11.00** Самы разумны.
**12.25, 4.20** Арол і рэшка.
**13.10** Байцоўскі клуб.
**14.10** Краіна смяецца.
**14.25** Кіеў вячэрні.
**16.00, 1.15** Футбол. Чэмпіянат Украіны. «Шахцёр» — «Дынама».
**18.00, 22.50** Парк аўтамабільнага перыяду.
**18.25, 23.40 Маст. фільм «Аператыўная распрацоўка-1».**
**20.00, 3.00** «Падрабязнасці».
**20.30** Вячэрні квартал.
**22.00, 3.30** Разбор палётаў.
**23.20** Цацкі для дарослых.
**5.05** Сваты. Жыццё без грыму.
**5.50 Маст. фільм «Цана скарбаў».**
**7.15** Формула кахання. Аляксандр Буйноў.

## КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Біблейскі сюжэт.
**9.35 «Наш дом». Маст. фільм.**
**11.10** Красуйся, горад Пятроў!
**11.35** «Асабісты час». Барыс Токараў.
**12.05 «Сябрук». Маст. фільм.**
**13.10** «Відавочнае—неверагоднае.
**13.35** «Партытуры не гараць».
**14.05** Тэлеспектакль «Гэта пікавая дама».
**14.55** «Палацы Еўропы». Дак. серыял.
**15.50** Вялікая сям'я.
**16.45** «Рамантыка рамансу».
**17.35** «Шпіёнскія страсці». М/ф.
**18.00 Шпіёнаманія. «Тайна двух акіянаў». Маст. фільм.**
**20.25** «Белая студыя».
**21.10 Да 80-годдзя з дня нараджэння Андрэя Таркоўскага. «Ахвярапрынашэнне». Маст. фільм.**
**23.35** Шоу «Іспанская гітара».
**0.35** «Фільм, фільм, фільм». М/ф для дарослых.
**0.55** «Заняпад гігантаў». Дак. фільм.
**1.50** «Ціха Браге». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Пад знакам «Пі». 1991 год.
**6.10** «Аб часе і аб сабе». 1986 год.
**6.40, 12.30, 0.40** «У адным мікрараёне». Спектакль.
**7.55, 14.00** «Бенефіс з.а. РСФСР Ларысы Галубкінай». 1975 год.
**9.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00** «Кінапанарама». 1989 год.
**11.00** «Чалавек і закон». 1991 год.
**12.00** «Будзільнік». 1981 год.
**15.00** «Колба часу».
**16.00** «Тэма».1993 год.
**17.00** «Да і пасля паўночы». 1990 год.
**18.20** «Пад знакам задыяка. Авен». 1994 год.
**19.50** «Песня-87».
**21.00 «Толькі ў мюзік-холе». Маст. фільм.**
**22.10** «Смехапанарама». 1995 год.
**23.00** «Служу Савецкаму Саюзу». 1989 год.
**23.55** «Рок-урок». 1992 год.
**2.00** «Хіт-парад «Астанкіна». 1993 год.
**4.00** «Залаты дыск-90». 1991 год.

## MTV

**5.00, 1.25** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**8.40** Руская дзясятка.
**9.40** «Губка Боб». М/ф.
**10.30** Тэлепорт.
**11.00** Нерэальныя гульні.
**11.30** Гарачае кіно.
**12.00** News блок Weekly.
**12.30** Зоркі на далоні.
**13.00, 23.35** Трагічныя гісторыі Галівуда.
**14.00, 21.00** «Канікулы ў Мексіцы-2».
**17.00** Тайн.net.
**18.00** Занадта прыгожыя.
**18.30** Шалёныя продкі. Руская версія.
**19.00** Спатканне ўсляпую.
**19.30** Зрабі мне зорку.
**20.00** Каханне на чацвярых.
**22.00** American Idol-11.
**0.25** Сусветны чарт.

1 **23.40** ФІЛЬМ ДНЯ

**«Маленькая Масква»** (Польшча, 2008 г.)

На захадзе Польшчы на магілу жонкі прыязджае расійскі грамадзянін Юрый Святлоў, які калісьці праходзіў тут службу. Следам за бацькам прыязджае яго адзіная дачка. Яна ненавідзіць сваю маці, якую ніколі не бачыла, але якой не можа дараваць самагубства з-за кахання да польскага афіцэра.



**Рэжысёр** — Вальдэмар Кшыстэк. **У ролях:** Святлана Ходчанкава, Леслаў Журэк, Дзмітрый Ульянаў, Юрый Іцкоў.

## НАША КІНО

**6.35, 12.35** Кінааповесць «Дажывём да панядзелка».
**8.30, 14.30** Маст. фільм «Клуб самагубцаў, або Прыгоды тытулаванай асобы».
**11.45, 17.45** Камедыя «Мядзведзь».
**18.35, 0.30** Меладрама «Ксенія, любімая жонка Фёдара».
**20.05** Плюс кіно.
**20.35, 2.30** Мюзікл «Востраў загінулых караблёў».
**22.50. 4.50** Камедыя «Бландзінка за рагом».

## ДОМ КІНО

**3.00, 19.10** Серыял «Таццянін дзень».
**3.45** Серыял «Аляксандраўскі сад-2».
**4.35, 11.55, 19.05, 2.55** «Акно ў кіно».
**4.40** Містычны трылер «Правасуддзе ваўкоў».
**6.10** Дзіцячы сеанс. «Палёт у краіну пачвар».
**7.25** Да юбілею Андрэя Таркоўскага. Драма «Андрэй Рублёў».
**10.25** Экранізацыя школьнай праграмы. А. Чэхаў «Сёе-тое з губернскага жыцця».
**12.00** Золата «Масфільма». «Яшчэ раз пра каханне».
**13.35** Музычная камедыя «Труфальдзіна з Бергама».
**15.50** Новы хіт. Меладрама «Пізанская вежа».
**17.30** Камедыя «Кітайскі «сервізъ».
**20.00** Сусветная прэм'ера. Драма «Дом».
**22.10** Трагікамедыя «Забытая мелодыя для флейты».
**0.20** Дэтэктыў «Туман».
**1.30** Камедыя «Маякоўскі смяецца».

## ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Маст. фільм «Маленькі ўцякач».
**6.45, 10.45, 14.45** М/ф «Віні-Пух».
**7.00, 11.00** М/с «Легенда пра Зора». Казкі народаў свету. «Браты Лю».
**8.00, 12.00** «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Сіні капялюшык». «Мы з Джэкам».
**15.00** Фільм-казка «Сумленнае чарадзейнае».
**16.10** М/ф «Віні-Пух ідзе ў госці». Зборнік м/ф. «Вялікая бітва слана з кітом». «Гаўрош». «Куды ідзе сланяня».
**17.00** Маст. фільм «Дзіцячы патруль».
**18.10** Казкі народаў свету. «Сын каменя». М/ф «Храбрэц-удалец».

## ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Матуля, я кілера кахаю!».
**20.00, 2.00** Серыял «Мянтоўскія войны-2».
**21.00, 3.00** Серыял «Дарожны патруль-4».
**22.00, 23.30** Серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».

## ТБ3

**5.00** М/ф.
**7.00** Маст. фільм «Як Іванка-дурань па цуд хадзіў».
**8.45** Серыял «Дынатопія». 1-я серыя.
**10.30, 3.15** Дак. фільм «Вербніца».
**11.30** Маст. фільм «Капальні цара Саламона».
**15.00** Маст. фільм «Цёмны рыцар».
**18.00** Здзіві мяне!
**20.00** Маст. фільм «Ілюзіяніст».
**22.00** Маст. фільм «Загадка Сфінкса».
**23.45** Маст. фільм «Звер з мора».
**1.30** Маст. фільм «Агонь».
**4.15** «Тайны вялікіх чараўнікоў».

## ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Драма «Палёт даўжынёю ў жыццё».
**10.40, 18.40, 2.40** Драма «Хаціко: Самы верны сябар».
**12.20, 20.20, 4.20** Драма «Пакоі смерці: вочы пацыенткі».
**14.00, 22.00, 6.00** Драма «Выпадак на мосце цераз Савіны раўчук, або Гісторыі Амброза Бірса аб Грамадзянскай вайне».
**15.25, 23.25, 7.25** Меладрама «Закаханыя».

## ТБ1000

**3.00, 23.05** Прыгоды «Касмічныя каўбоі».
**5.10, 21.30** Драма «Іншы мужчына».
**7.00** Камедыя «Узорны самец».
**8.40** Драма «Кантакт».
**11.10** Камедыя «Выскачка».
**13.00** Камедыя «Дзікі, дзікі Захад».
**15.00** Драма «Здраднік».
**17.00** Драма «Я ведаю, што ты ведаеш».
**19.00** Драма «Трэнер Картэр».
**1.10** Камедыя «Траўка».

## ІЛЮЗІЁН

**1.15** Ну што, згуляем?
**3.40** Старэй, чым Амерыка (Пастыр. Бітва за душы).
**5.30** Дзеткі ў парадку.
**7.25** Кірмаш ганарыстасці.
**9.45** Мой лепшы палюбоўнік.
**11.40, 23.00** Доктар Т і яго жанчыны.
**13.50** Як я сябраваў у сацыяльнай сетцы.
**15.20** Бераг маскітаў.
**17.45** Закладнікі.
**19.30** Амфібія.
**21.05** Спадарыня.

## DIVA UNIVERSAL

**5.00** Горад прышэльцаў.
**8.20** Шпік.
**10.50** Хэйвен.
**12.20** Танцуй да ўпаду.
**13.10** Копы-навабранцы.
**14.50** Бацькі.
**16.20** Добрая жонка.
**17.10** Камедыя «Мядовы месяц з мамай».
**18.45** Драма «Салодкі кавалачак».
**20.00** Камедыя «Вось такія пірагі».
**21.30** Камедыя «Правілы здыму: метад Бабніка».
**23.10** Сястра Джэкі.
**0.10** Дамы сям'і Гілмор.
**1.50** Маст. фільм «Дамова на цяжарнасць».
**3.25** Драма «Хлопец маёй дзяўчыны».

## РАМАНТЫКА

**7.00, 18.40, 21.30, 0.55** «Амазонія».
**7.55** «Спакуснік».
**12.20, 17.50** «Смачнае захапленне».
**13.20** «Дасканалая прыгажосць».
**19.35, 1.50** «Дваяжэнец».
**22.25** «Ніхто не ведае нічога».
**0.00** «Мужчынскія гісторыі, адрасаваныя жанчынам».
**2.40** «Пражыць жыццё».

## AXN-SciFi

**0.10, 2.50, 7.20** Застацца ў жывых.
**0.50, 4.15, 9.30** Бліч.
**1.15, 5.00, 13.30** Зорны шлях.
**3.30, 23.05** Фактар страху.
**6.30** Паляўнічыя на монстраў.
**8.15, 15.35** Зорны дэсант.
**9.05, 15.10** Страшна цікава.
**10.25, 17.35, 22.15** Дзевяць жыццяў Хлоі Кінг.
**11.15, 23.50** Зорная брама.
**16.20** Каўчэг.
**18.30** Misfits.
**20.00** Кайл XY.
**21.30** Кліч крыві.

## EUROSPORT

**9.30, 1.00** Ралі. Серыя IRC.
**10.00, 1.30** Веласпорт. Чэмпіянат свету па велагонках на трэку.
**16.00** Акадэмічнае веславанне. Оксфард — Кэмбрыдж.
**17.00, 20.30** Тэніс. Турнір WTA.
**18.00** Вось гэта дзіва!!!
**19.00** Конны спорт. Global Champions Tour.
**23.45** Кёрлінг. Чэмпіянат свету.

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 18.00** Мегазаводы.
**6.00** Дынаманія.
**7.00** Астравы.
**8.00** Марскі патруль.
**9.00** Некранутая прырода.
**10.00** Даведнік па свеце для гурманаў.
**11.00** Мяжа.
**12.00** Шалёныя вынаходнікі.
**13.00** Рыбы-пачвары.
**14.00** У пошуках акул.
**15.00** У пошуках жывых канібалаў.
**16.00** Амазонія.
**17.00** Тайны вакол нас.
**19.00, 0.00** Расследаванні авіякатастроф.
**20.00, 1.00** Ліхтугі за мяжой.
**21.00, 2.00** Турэмныя цяжкасці.
**22.00** Суперзбудаванні старажытнасці.
**23.00, 4.00** Апакаліпсіс.
**3.00** Забароны.

## DISCOVERY

**7.00, 3.50** У пагоні за ўраганам.
**7.55, 23.00** «Паляўнічыя на старызну».
**8.50, 18.00** Залатая ліхаманка.
**9.45** «Брудная работка».
**10.40** «Вытворчасць».
**11.35, 19.00** «У разрэзе».
**12.30** Гіганцкія караблі.
**13.25, 20.00** «Мужчына, жанчына, прырода».
**14.20** Будаўнічая дапамога.
**15.15, 21.00, 5.10** Каралі аўкцыёнаў.
**16.10, 22.00, 6.05** «Дылеры».
**17.05, 4.45** «Як гэта ўстроена?».
**17.30** Як гэта зроблена?
**0.00** Законы банды.
**1.00** «Я ўцёк».
**2.00** «Хлопцы з гарматамі».
**2.55** Лесапавал на балотах.

## ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Выдаткі вытворчасці.
**5.40, 20.40** Практыкаванні для мозга.
**6.20, 21.20** Што мы носім?
**6.50, 21.50** Не выходзячы з дома.
**7.30, 22.30** Колькі вам гадоў?
**8.00, 23.00** Дзіцячы ўрач.
**8.40, 23.40** Цела чалавека.
**9.20, 0.20** Кабінет прыгажосці.
**9.55, 15.10, 0.55** Шлях да здароўя.
**10.30, 1.30** Пазнай сябе.
**11.00, 2.00** Алергія.
**11.40, 2.40** Пра дыеты і не толькі.
**12.20, 3.20** Як не страціць здароўе.
**12.50, 3.50** Найноўшыя дасягненні.
**13.30, 4.30** Перадродавае выхаванне.
**14.00** Гісторыя хвароб.
**14.40** Зона рызыкі.
**15.35** Школа розуму.
**16.15** Генезіс здароўя.
**17.10** Элемент здароўя.
**17.40** Энцыклапедыя памылак.
**17.55** Зялёная аптэка.
**18.35** Памылкі здароўя.
**19.15** Дыялогі пра харчаванне.

## TRAVEL

**8.00, 13.00, 17.00, 20.00, 0.00, 5.00** Сусветны падарожнік.
**9.00** Сафі Грыгсан у графствах Радзімы.
**10.00** Водары Паўднёвай Афрыкі.
**11.00** Вясна.
**12.00** Прыпынкі на сафары.
**14.00** Падарожнік трэцяга класа.
**15.00, 6.00** Пакаранне для абжоры.
**18.00** Круіз у пошуках прыгод.
**19.00** Падарожжа сёння.
**19.30** Пра галоўнае.
**21.00** Сафі Грыгсан у Тайландзе.
**21.30** Сафі Грыгсан едзе на Усход.
**22.00, 2.00** Падарожжа па Індыі цягніком класа люкс.
**23.00** Раскошныя падарожжы.
**1.00** Планета спорту.
**3.00** Людзі мора.
**4.00** Свет жанчыны.
**7.00** Флойд у Афрыцы.

## ANIMAL PLANET

**7.00** Школа гарыл.
**7.25** Паляўнічы на кракадзілаў.
**8.15** Прагулкі Джэфа Корвіна.
**9.10** Прыроджаныя паляўнічыя.
**10.05** «Самае дзікае шоу».
**11.00** Заасад Крыса Хамфры.
**11.25** «Ветэрынар Бандай Біч».
**11.55** Уводзіны ў сабаказнаўства.
**12.50** «SOS дзікай прыроды».
**13.45** Перакладчык з сабачай.
**14.40** Дзікія сіроткі.
**15.35** Паляўнічы на яд.
**16.30** Выклік «Вялікай пяцёрцы».
**17.25** «Найджэл Марвен прадстаўляе».
**18.20, 4.25** Дзікая Францыя.
**20.10** Незвычайныя жывёлы.
**21.05** Прыгоды Осціна Сціvенса.
**22.00, 2.35** У нетры дзікай прыроды.
**22.55, 3.30** Самыя неверагодныя на «Animal Planet».
**23.50, 6.10** Паліцыя Філадэльфіі — аддзел па абароне жывёл.
**0.45** Дзікія і небяспечныя.
**1.40** Кракадзілы-забойцы.
**5.20** Рай для шымпанзэ.
**5.45** На дне бездані.

## ТДК

**6.00, 7.50, 13.50, 16.55, 17.50, 18.50** Парады ТДК.
**6.25, 9.00, 15.00, 21.20** Усё лепшае для вас.
**7.25, 12.00, 18.00, 21.00, 23.45, 5.00** Ваш доктар.
**8.00** Добрай раніцы, каханая!
**10.00, 17.00** Красуня.
**11.00, 16.00, 20.00** Ваш асабісты псіхолаг.
**13.00, 2.00** Нашы дзеці.
**14.00, 1.00** Твой дом.
**19.00, 22.50, 4.00** Люстэрка жыцця.
**22.00, 0.05** Сэксуальная рэвалюцыя.
**3.00** Гісторыя поспеху.

# «ГЭТА КНІГА ПРА НАС!»



— У гэтай кнізе расказваецца пра нашы спевы і танцы, — сказала школьніца Валя ПАЛЬКО з гурта «Берагіня».

**Так адказала школьніца з вёскі Мётча Валя Палько на маё пытанне, што за прыгожая кніга ў яе руках. Чырвоная вокладка адлюстроўвала яркі колер вышываных кветак на белай кашулі дзяўчынкі. Такі фотаздымак я зрабіў у час прэзентацыі пятага тома шасцітомнага выдання «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», якая праходзіла ў Мінску.**



Спявае настаўніца беларускай мовы і літаратуры, мастацкі кіраўнік «Берагіні» Антаніна АБРАМОВІЧ.

Прэзентацыі новых выданняў у сталіцы адбываюцца ледзь не кожны дзень, але рэдка бывае, каб на дзень нараджэння кніжкі ў горад прыязджаў такі вялікі, вясёлы гурт вясковых дзяцей. Варта зазначыць, што дзіцячы ўзорны фальклорны гурт «Берагіня» прыбыў на свята далёка не ў поўным складзе — дэлегавана была «мабільная група». Але і гэтага дастаткова, каб захапіць усіх гледачоў вясёлымі прыпеўкамі, імклівай полькай у розных варыянтах.

Названае выданне абагульніла вынікі пяцігадовага (2006-2010) комплекснага фальклорна-этнаграфічнага даследавання традыцыйнай мастацкай культуры рэгіёна Цэнтральнай Беларусі. Гэтае даследаванне правялі члены часовага творчага калектыву, створанага пры Інстытуце мовазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Мётчанскую школу называюць этнашколай. Тут на справе пацверджана: неталенавітых дзяцей няма. Сярод выпускнікоў вы сустрэнеце вядомага літаратара і архімандрыта, спартсмена — чэмпіёна свету — і рэктара ВНУ... Сённяшнія вучні старанна вывучаюць гісторыю роднага краю, пераймаюць ад бабуль і дзядуляў узоры старажытных спеваў, танцаў, найгрышаў на традыцыйных інструментах. На гербе школы ёсць выява пчолкі, што сімвалічна гаворыць аб працавітасці ў назапашванні ведаў. Калі ўзгадаць, што такая ж пчолка і на аўтапартрэце Францыска Скарыны, то размова зноў прывядзе нас да кніг — у прыватнасці, да новага выдання, якое распавядае пра традыцыйную мастацкую культуру беларусаў.



Такія карагоды вадзілі ў даўнія часы.

Новы том убачыў свет у выдавецтве «Вышэйшая школа». У яго ўвайшлі матэрыялы пра танцавальны фальклор, народныя гульні і прозу, замовы, традыцыйнае адзенне. Аўтары Алена Боганева, Тамара Варфаламеева (ідэя і агульнае рэдагаванне) і іншыя данеслі да чытача багаты збор, ілюстраваны фотаздымкамі і нотамі. Тут і электронны дадатак з аўтэнтычнымі запісамі народнай прозы ў выкананні носьбітаў традыцыі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**
*Барысаўскі раён.*

■ 36,6

# У ЗОНЕ ВЫСОКАГА ЦІСКУ

**Штогод колькасць гіпертонікаў у Беларусі прырастае на 5-10 працэнтаў. Тэндэнцыя росту захоўваецца ва ўсім свеце і носіць характар пандэміі. Так, калі ў 2000 годзе ад гіпертаніі пакутаваў кожны чацвёрты жыхар планеты, то ў 2025-м пакутаваць ужо будзе кожны трэці. Разам з тым, гэты вядучы фактар рызыкі сардэчна-сасудзістай захваральнасці і смяротнасці з'яўляецца, што называецца, падкантрольным, інакш кажучы, сучасная дыягностыка і лячэнне здольныя паспрыяць зніжэнню як захваральнасці, так і смяротнасці.**

На вялікі жаль, трымаць гіпертанію пад кантролем удаецца далёка не ўсім. «Загалам паспяховага лячэння застаецца дасягненне мэтавага ўзроўню артэрыяльнага ціску — не вышэй за 140/90 мм рт. сл., — тлумачыць **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі РНПЦ «Кардыялогія» Вольга ПАЎЛАВА**. — Паводле аднаго айчыннага даследавання, з 1 тысячы пацыентаў такіх лічбаў дасягнулі не больш як 30 працэнтаў».

Акрамя павышанага ціску, неабходна ўлічваць і іншыя фактары сардэчна-сасудзістай рызыкі — высокі халестэрын, курэнне, наяўнасць лішняй вагі, парушэнне вугляводнага абмену. Усё гэта стала настолькі распаўсюджаным, што цяпер значэнне гэтых фактараў нельга недаацэньваць нават тады, калі размова ідзе пра дзяцей і падлеткаў. Калі раней праблема ранняй артэрыяльнай гіпертэнзіі ў моладзі была абумоўлена якой-небудзь хранічнай паталогіяй, то сёння медыкі гавораць пра тыя ж прычыны, што і ў дарослых, кажа **старшыня Беларускай Лігі па барацьбе з высокім артэрыяльным ціскам Ірына ЛАЗАРАВА**: «Асноўнымі прычынамі павышэння артэрыяльнага ціску ў дзяцей да 13 гадоў застаюцца другасныя, звязаныя з наяўнасцю ныркавай, эндакрыннай і іншых паталогій, а вось пасля 13 гадоў пачынае назірацца эсэнцыяльная гіпертэнзія, якая не мае адзінай прычыны павышэння ціску».

Словам, нават самая найсучасная лекавая тэрапія не дапаможа гіпертоніку, які не змяніў уласны лад жыцця. Дарэчы, што да медыкаментознага лячэння, то сёння шырока выкарыстоўваецца камбінаваная тэрапія, калі ў адной таблетцы змяшчаецца два прэпараты. А ў навукова-практычным цэнтры «Кардыялогія» праводзяць хірургічныя



ўмяшанні, якія дапамагаюць скарэкціраваць ціск у тых выпадках, калі ён мае другаснае паходжанне і абумоўлены, скажам, ныркавай паталогіяй.

Аднак любыя высокія тэхналогіі і самыя эфектыўныя пілюлі акажуцца неэфектыўнымі і не прывядуць да пажаданага выніку, калі не скарэкціраваць лад жыцця. Безумоўна, ёсць фактары, на якія немагчыма паўплываць — пол, спадчыннасць, раса, аднак значна больш тых, якія можна скарэкціраваць і атрымаць сапраўды станоўчы вынік. Перш за ўсё, неабходна мець на ўвазе, што курэнне, у тым ліку і пасіўнае, адназначна спрыяе высокаму ціску (не гаворачы пра іншыя непрыемнасці, абумоўленыя тытунём). Павышае ціск і алкаголь, а таму гіпертонікам ён супрацьпаказаны або дазваляецца ў мізэрных дозах. Па-другое, у харчаванні неабходна імкнуцца да абсалютнага мінімуму спажывання солі (літаральна на працягу двух месяцаў смакавая адчувальнасць аднаўляецца і жаданне ўжываць салёную ежу знікае), жывёльных тлушчаў і вугляводаў, якія хутка засвойваюцца. Неабходна ўжываць болей садавіны і гародніны — да 500 гр. за дзень. Жыццё павінна быць фізічна актыўным.

### Павінен ведаць кожны

✓ У хатніх умовах для вымярэння артэрыяльнага ціску можна выкарыстоўваць паўаўтаматычныя і аўтаматычныя электронныя танометры. Падчас першай працэдуры неабходна памераць ціск на абедзвюх руках з інтэрвалам у 2-3 хвіліны. На ўзбраенне трэба браць тое значэнне, якое аказалася вышэй.

✓ Аптымальным лічыцца артэрыяльны ціск менш за 120/80 мм рт. сл., нармальным — 120-129/80-84, высокім нармальным — 130-139/85-89, 1-я ступень артэрыяльнай гіпертэнзіі — 140/90.

✓ Калі ваш артэрыяльны ціск хоць бы аднойчы ўзнімаўся вышэй за 135/85 мм рт. сл. — час біць трывогу, збірацца на прыём да ўрача. Аб'ём даследаванняў і прызначання лячэння будзе залежаць ад індывідуальных асаблівасцяў пацыента.

✓ Дзецям ціск павінен вымяраць урач, прычым рабіць гэта трэба не раз і не два, а некалькі разоў і арыентавацца пры гэтым на звесткі спецыяльных табліц, паколькі для кожнага ўзросту, полу і росту існуюць свае значэнні нормы.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

## У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ



**Ці будуць зменены падыходы да прызначэння і выплаты дапамог маці-адзіночкам? Многія з іх фактычна знаходзяцца ў шлюбе, але не рэгіструюць яго ў органах ЗАГС для атрымання пэўных ільгот. Пра тое, ці змогуць яны атрымліваць іх і ў далейшым, чытайце ў заўтрашнім нумары «Звязды».**



**У моладзі дуда сёння выклікае насамрэч неверагодны інтарэс. Навучыцца іграць на гэтым інструменце мараць не толькі хлопцы, але і дзяўчаты! Чым толькі яны не ўпрыгожваюць свае дуды! І гэта выдатна. Здаецца, мадэрнізуючы і пераасэнсоўваючы старадаўнюю традыцыю, мы паціху вучымся любавацца і ганарыцца сваім уласным.**

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Фісташкі. Адат. Тур. Арка. Лука. Сена. Грош. Анод. Рама. Украінка. Агарак. Кай. Раска. Ізабара. Сіп. Воз. «Ака». Булава. Санар. Карэ. Туз. Торф. Ветка. Агат. Легата. Адам. Нара. Улар. Траўнік.

**Па вертыкалі:** Міндаль. Арахіс. Какос. Санет. Кліка. Гама. Партал. Свет. Загана. Абаранак. Гадар. Рана. Аратар. Кварк. Кіа. Тамат. Агдам. Бэз. Рагу. Корак. Лот. Шарапава. Май. Ровар. Фрак. Каза. Фундук.

## ■ Муз-news

### «Троіца» стала пяць разоў першай

**Такой займальнай арыфметыкай запомніліся сёлетнія ўзнагароды сайта Experty.by. Па выніках 2011 года менавіта альбом этна-трыа «Троіца «Зімачка» быў прызнаны найлепшым адразу ў пяці версіях: штатных экспертаў, «вялікага журы» з 12 вядомых музычных крытыкаў, народнага журы, а таксама ў катэгорыях «найлепшы беларускамоўны альбом» і «найлепшы фолк-альбом».**



Фота Пятра ФАМІНА.

Іншае меркаванне мелі толькі замежныя эксперты: прадстаўнікі 5 краін, з якімі мяжуе Беларусь, аддалі першае месца гурту «Сярэбранае вяселле» з альбомам «Сардэчная мускулатура». Мабыць, экспартны патэнцыял у фрык-кабарэ-бэнда сапраўды большы, чым у сакральных беларускіх спеваў. Але, як падказвае сучасная народная мудрасць, на смак фламастары розныя — і свайго слухача, безумоўна, знойдуць усе няўрымслівыя ды таленавітыя. Балазе, такіх хапае: за мінулы год эксперты праслухалі і рэцэнзавалі 63 беларускія альбомы.

«Адметнасць у тым, што мы не спрабуем прывесці ўсё да аднаго пераможцы і адной думкі, — сцвярджае кіраўнік праекта Зміцер Бескаравайны. — Мэта зусім іншая — адлюстраваць розныя пункты гледжання. Калі хаця б некаторыя з іх супадуць, значыць, у нашай музычнай прасторы быў яўны лідар».

Сёлетнія прэміі ўручаліся ўжо чацвёрты раз. Летась лідарам па колькасці перамог стаў гурт «Дзецідзяцей», па выніках 2009 года — The Toobes, за 2008 год лепшымі былі названыя «Троіца» і «Ляпіс Трубяцкой».

### Пакуль рок не памрэ, і каранацыя жыве?

**«Караблі лавіравалі, лавіравалі, ды не вылавіравалі» — гэта моўная задачка як найлепш пасуе цырымоніі «Рок-каранацыя», якую арганізатары штогод абяцаюць то пахаваць, то адрэстаўраваць, то перафарматаваць, а ў выніку ўсё адно праводзяць. Вось і сёлета рок-кароны знойдуць сваіх уладальнікаў — 31 сакавіка на сцэне Палаца культуры Маладзечна.**

Уласна музычная частка цырымоніі абяцае быць даволі сціплай: пацверджаны ўдзел усяго 5 калектываў: Drum Ecstasy, Znich, Akute, ZM99 і Аляксандр Кулінковіч. А другое аддзяленне плануецца цалкам аддаць пад канцэрт «J:Морс» — як распавядае заснавальнік і прадзюсар прэміі Юрый Цыбін, з мэтай «прыцягнуць увагу гледачоў і, магчыма, акупіць мерапрыемства».

Ужо вядома, што тытул рок-князёўны дастанецца Зоі Сахончык — вакалістцы гурта ZM99, пераможцы ў іншых 8 намінацыях будуць названыя ўжо непасрэдна на цырымоніі.

Гледачам за задавальненне пабачыць і пачуць усіх названых ды яшчэ лаўрэатаў «Рок-каранацыі» прапануецца выкласці ад 60 да 90 тысяч рублёў — а што вы хочаце, пры наяўнасці нуля цэлых нуля дзясятых спонсараў трэба зарабляць самім. Будучыня прэміі пакрытая змрокам (перачытваем наноў пачатак заметкі) з традыцыйным беларускім падыходам «нешта будзе...». Пакуль жа, будзем шчырыя, пацыент хутчэй ніякі, чым жывы і здаровы.

**Падрыхтавала Кацярына ШАЮК**

## Дзве даты — 30 сакавіка

**1522 год** — нарадзіўся Мацей Кавячынскі, беларускі кнігавыдавец, перакладчык, рэфарматар. Заснаваў порт на рацэ Узда, папяровую фабрыку ў Нясвіжы. У 1561—1562 гадах разам з С. Будным і Л. Крышкоўскім заснаваў Нясвіжскую друкарню, у якой былі надрукаваны першыя ў Беларусі выданні на беларускай мове — «Катэхізіс» і «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам» Сымона Буднага. Аўтар прадмоў да некаторых нясвіжскіх выданняў. Большасць кніг яго друкарні выходзіла ў афармленні, падобным да скарынаўскіх.



**1867 год** — быў падпісаны дагавор аб продажы Расіяй Аляскі Злучаным Штатам. Царскі ўрад спрабаваў пазбавіцца ад Аляскі і Алеуцкіх астравоў яшчэ раней, але перамовам перашкодзіла грамадзянская вайна ў ЗША. А прычын для продажу было некалькі. Перш за ўсё, гэта немагчымасць захаваць рускія заакіянскія тэрыторыі ў выпадку вайны, што ясна паказала Крымская вайна. Колькасць рускіх у калоніях складала тады ўсяго 600 чалавек. Важным фактарам было і перанясенне інтарэсаў урада Расіі на Прыамурскі рэгіён і Сярэднюю Азію. У Амерыцы многія працівіліся набыццю халоднай і, здавалася, бескарыснай зямлі. Ідэю куплі называлі «вар'яцтвам Сюарда», па імені дзяржаўнага сакратара ЗША, які асабліва дамагаўся гэтай здзелкі. Рускі пасол барон дэ Штокль запрасіў 10 мільёнаў долараў, Вільям Сюард прапанаваў пяць. Сышліся на цане 7 мільёнаў 200 тысяч. Атрымалася ўсяго па 2 цэнты за акр зямлі. Праз 29 гадоў на Алясцы было знойдзена золата, а ў XX стагоддзі — нафта.

**Было сказана:**

*«Самыя расчараваныя людзі на свеце — людзі, якія атрымалі тое, чаго дабіваліся».*
**Олівер Уэндэл (1809—1894), амерыканскі ўрач, паэт і пісьменнік.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.47 | 19.42 | 12.55 |
| Віцебск — | 6.35 | 19.33 | 12.58 |
| Магілёў — | 6.37 | 19.33 | 12.56 |
| Гомель — | 6.35 | 19.28 | 12.53 |
| Гродна — | 7.02 | 19.57 | 12.55 |
| Брэст — | 7.04 | 19.56 | 12.52 |

**Месяц**
*Першая квадра ў 22.42.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

**Імяніны**
***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Віктара, Макара.*
***К.*** *Амеліі, Ірыны, Леанарда, Яна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Школьніца, якая зрабіла татуіроўку без дазволу, атрымала дома рэменем крыху ніжэй матылька.**

— Я такі худы, такі худы...
— ?
— Вось учора на граблі наступіў...
— Ну, і?
— Ну, ну... Міма!

**Чыста не там, дзе прыбіраюць, а там, дзе дворнік са стрэльбай.**

Муж глядзіць тэлевізар і ўслых ціха кажа:
— Не ідзі туды, ну не ідзі...
Жонка пытаецца:
— Што глядзіш?
Муж:
— Наша вяселле.

**Прыгожая бландзінка з грудзьмі чацвёртага памеру, якая выпадкова зазірнула на карпаратыў, сапсавала настрой усёй жаночай палове калектыву.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л.ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л.СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 1414.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 29 сакавіка 2012 года.